# «МОТАВЕЛА ПАВІННА ЖЫЦЬ,

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У той жа год у сталіцы прыступілі да стварэння сучаснага вытворчага комплексу. Мінскаму гарадскому тэхнапарку быў перададзены зямельны ўчастак на Партызанскім праспекце плошчай 27,6 га, на якім размяшчалася 60 асобна стаячых будынкаў і збудаванняў агульнай плошчай 160 тысяч кв. м. З іх выкарыстоўвалася толькі каля 60 %. Зношанасць будынкаў і інжынерных сетак складала ад 40 % да 100 %. У жніўні 2022 года Аляксандр Лукашэнка асабіста праверыў, як ідзе праца над стварэннем тэхнапарка. Тады ён патрабаваў будаваць па-сучаснаму, якасна і хутка.

У 2025 годзе можна сцвярджаць, што задача выканана. Сёння на гэтай пляцоўцы дзейнічаюць 68 арандатараў і 26 рэзідэнтаў тэхнапарка, яны займаюць плошчу ў 79,9 тысячы квадратных метраў. Сёлета прадпрыемствам будзе прадстаўлена для размяшчэння плошча яшчэ ў 126 тысяч квадратных метраў.

Рэканструкцыя ідзе, і фінансаванне не завершана. Поўная акупнасць затрат на рэканструкцыю чакаецца ў 2031 годзе. А пасля поўнага завяршэння работ плануецца размясціць на Партызанскім праспекце 140 прадпрыемстваў, у тым ліку 40 рэзідэнтаў Мінскага гарадскога тэхнапарка з гадавым аб'ёмам вытворчасці каля 300 мільёнаў рублёў. Паколькі гэта тэма была на пастаянным кантролі кіраўніка дзяржавы, з дзейнасцю Мінскага гарадскога тэхнапарка Прэзідэнт азнаёміўся асабіста.

## «Лакалізацыя для нас — найважнейшае пытанне»

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў далажыў аб рэканструкцыі пляцоўкі тэхнапарка, аб яго перспектывах. Найперш кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, якія яшчэ праблемы не вырашаны, што насцярожвае. Але старшыня Камітэта дзяржкантролю Васіль Герасімаў запэўніў, што ўсё ідзе па плане, хіба што застаюцца пытанні па лакалізацыі. «Лакалізацыя для нас — найважнейшае пытанне. Гэта не проста іміджавы праект. Мы трактары рабілі ў савецкія гады, аўтамабілі (МАЗы), веласіпеды, матацыклы — так, імідж. Але ў чым сутнасць гэтай праблемы? Мы спыніліся на тым, што трэба развіваць свае школы. **Тое, што нам дасталася ад тых пакаленняў, трэба не толькі захаваць — трэба развіваць і мадэрнізаваць.** «МотаВелаЗавод» у гэты спіс трапіў. Нам трэба развіваць тое, што мы ўмеем рабіць і што ўжо зроблена», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, у Беларусі «пайшлі ад зямлі» і сталі развіваць тыя школы, якія ў нас былі і прадукцыя якіх сапраўды патрэбна краіне, напрыклад, трактары, веласіпеды, матацыклы і іншае. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу: беларусы могуць зрабіць што заўгодна, нават касмічную ракету. Але, па-першае, гэта дорага. А, па-другое, ці сапраўды яны патрэбны краіне?

Увазе кіраўніка дзяржавы прадставілі ўзоры прадукцыі некаторых прадпрыемстваў — рэзідэнтаў тэхнапарка. Яны працуюць у розных кірунках ад медыцыны да праектавання лёгкіх стальных канструкцый. Самае важнае, што гэта імпартазамяшчальная прадукцыя запатрабавана ў Беларусі і мае добры экспартны патэнцыял. «Вось такія вытворчасці трэба ствараць. І я не выключаю, а гэта дакладна будзе з сусветнага вопыту, што мы паступова будзем пашыраць гэтыя вытворчасці», — адзначыў Прэзідэнт.

Асаблівую ўвагу беларускі лідар удзяліў прадукцыі ТАА «МотаВелаЗавод». Дырэктар прадпрыемства Сяргей Манько расказаў, што беларуская мота- і велапрадукцыя карыстаецца вялікім попытам як унутры краіны, так і на замежных рынках. «Ну вось. А гаварылі, нам не трэба ні веласіпеды, ні матацыклы. **Аказваецца, нам усё трэба. Веласіпед і матацыкл — гэта будучыня»,** — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён пацікавіўся, як на прадпрыемстве рэалізоўваецца палітыка імпартазамяшчэння. Дырэктар адказаў, што да вытворчасці падключаны і іншыя прадпрыемствы сістэмы Міністэрства прамысловасці, і прыватныя кампаніі. Па асобных мадэлях узровень лакалізацыі дасягае 80 %. «Гэта добра зрабілі, што задзейнічалі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але каб не спыняліся».

## «Для нас важна, каб вы развіваліся»

Кіраўнік дзяржавы асабіста азнаёміўся з работай некаторых прадпрыемстваў — рэзідэнтаў Мінскага гарадскога тэхнапарка. Па дарозе да іх з чыноўнікамі паспелі пагаварыць пра найважнейшыя пытанні. Напрыклад, пра другую атамную электрастанцыю. Як заўважыў Прэзідэнт, ён усё больш схіляецца да яе будаўніцтва, паколькі запатрабаванасць у электраэнергіі толькі расце. Не пакінулі без увагі і пяцігодку якасці, і Год добраўпарадкавання. Тут задачы нязменныя — навесці парадак там, дзе гэта неабходна.

Першым Аляксандр Лукашэнка наведаў прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Глобалхарчсэрвіс», якое з'яўляецца распрацоўшчыкам і вытворцам абсталявання

# «СЁННЯ НЕ СЛОВЫ ПАТРЭБНЫ. СЁННЯ ПАТРЭБНЫ СПРАВЫ»

**По традыцыі наведвання прадпрыемстваў, кіраўнік дзяржавы паразмаўляў з калектывам. «Вельмі рады, што, напэўна, не дарма мы задумалі гэту бітву, пачынаючы з аднаўлення Мотавелазавода і заканчваючы тым, што тут ужо 140 кампаній будуць працаваць і вырабляць патрэбную тэхніку», — прывітаў Прэзідэнт супрацоўнікаў Мотавелазавода і работнікаў прадпрыемстваў — рэзідэнтаў тэхнапарка.**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што некалі з аб'ектам на Партызанскім праспекце была цэлая эпапея. Спачатку прыватызацыя, маўляў «прыватнік прыйдзе — выратуе». Кіраўнік дзяржавы ўспомніў, што на гэту пляцоўку «паклалі вока» асобныя дзеячы, якія хацелі аднавіць вытворчасць, але ўмовы выконваць не збіраліся.

Потым кіраўніцтву краіны прапанавалі знесці Мотавелазавод і пабудаваць на гэтай тэрыторыі жыллё — месца вельмі зручнае, недалёка ад цэнтра Мінска. «Прасцей за ўсё жыллё, адзін рубель узяў, 20 потым атрымаеш, прадасі даражэй. Рынак жа, бескантрольна ўсё. Калі мы спрабавалі дзесьці нешта кантраляваць, то нас пачыналі душыць: амерыканцы, Захад, нават расіяне. Чаму душылі? «У вас не рынкавая эканоміка», то-бок няма свабоды «што хачу, тое і раблю». Калі дзяржава пачынае рэгуляваць нешта — «не рынкавая эканоміка», значыць, вам крэдытаў няма або пад вялікія працэнты, вашу прадукцыю купляць не будзем і гэтак далей... Мне гэта прыйшлося прайсці, але мы не адмовіліся ад вытворчасці. Гэта было маё першае патрабаванне. Мы будзем дапамагаць усім, хто працуе на краіну, але перш за ўсё вытворцам», — працягнуў успамінаць гісторыю гэтага месца кіраўнік дзяржавы.

У выніку Мінскаму гарвыканкаму было даручана аднавіць гэту пляцоўку. «Мотавела павінна жыць, і гэта непарушны прынцып.

> **«Мотавела, МАЗ, БелАЗ і іншыя прадпрыемствы — гэта брэнды нашай краіны. За гэтым стаіць вялізная колькасць людзей, гэта школы, гэта кампетэнцыі, гэта вы. Калі Мотавела не будзе — загіне школа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.**

Паводле яго слоў, страціць такую моцную школу нам зусім не трэба, да таго ж людзям абсалютна дакладна патрэбны матацыклы і веласіпеды.

Цяпер на тэрыторыі Мотавелазавода не толькі мадэрнізуюцца старыя карпусы, але і будуюцца новыя, за што Прэзідэнт падзякаваў кіраўніцтву Мінска. «Пакуль усё ідзе так, як дамовіліся. Чыста. А дзе пабудаваць жыллё, мы дамовімся», — адзначыў беларускі лідар. Ён расказаў, што ў краіне будзе ўзводзіцца арэнднае жыллё для работнікаў прадпрыемстваў. «Дырэктару — квадратныя метры, калі ласка, наймай людзей, няхай працуюць усе, хто хоча», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## «Мы павінны да іх па-людску паставіцца»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў размове з кіраўніцтвам тэхнапарка абмяркоўвалася тэма працоўнай міграцыі. Абмеркаванне гэтага пытання працягнулася ў размове з калектывам. «Насцярожвае тое, што з Расіі хлынула неарганізаваная міграцыя, перш за ўсё з цэнтральнаазіяцкіх рэспублік. А што гэта за людзі? Мы іх ведаем?» — падзяліўся клопатамі Прэзідэнт. Паводле яго слоў, кіраўнікі, запрашаючы на працу мігрантаў, павінны ведаць, што гэта за людзі, і быць упэўненымі, што яны патрэбны на прадпрыемстве. «Не



Фота БелТА.

ўмеюць — навучы. Але ты за гэтых 10—20 чалавек павінен галавой адказваць. Мы павінны да іх па-людску паставіцца. Яны такія ж людзі, як мы, але яны бягуць ад бяды. Яны ўжо пакаштавалі гэтага жыцця, і яны заўсёды добра працуюць, калі да іх па-чалавечы», — арыентуе беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў грамадзян іншых краін у Беларусі будзе доступ і да адукацыі, і да медыцыны. Усё будзе як у нас. Асабліва, звярнуў увагу Прэзідэнт, для ўкраінцаў. «Вельмі шмат украінцаў сёння едуць да нас. Мы павінны прымаць іх як сваіх людзей. Тыя людзі, якія да нас прыехалі з Украіны, я не чуў, каб нехта сказаў, што яны дрэнна працуюць. Гэта добрыя людзі», — сказаў беларускі лідар. Паводле яго слоў, у найбліжэйшы час гэтыя пытанні будуць разглежданы на самым высокім узроўні.

> **«Пакуль пажар не палае ў Беларусі, гэтым пытаннем трэба займацца. Тым больш нам людзі патрэбны. Але кожнага чалавека трэба глядзець», — заявіў кіраўнік дзяржавы.**

## «Менш жалеза — больш мазгоў»

Вяртаючыся да размовы аб Мотавела і тэхнапарку, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што справы тут ідуць нядрэнна. Ён назваў кірунак, па якім хацеў бы атрымаць эфект, — маштабы прадпрыемства. «Трэба маштабаваць гэтыя вытворчасці. Пачынаць трэба з малога, а далей будзем дапамагаць, няхай развіваецца», — падкрэсліў беларускі лідар. Гэта датычыцца як дзяржаўных, так і прыватных прадпрыемстваў, рэзідэнтаў Мінскага гарадскога тэхнапарка. «І мы гэтым прыватнікам будзем дапамагаць. Ніякай настроенасці ў Беларусі няма і не будзе супраць прыватнай вытворчасці, тых, хто плаціць падаткі, плаціць нармальную зарплату, прадае прадукцыю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы аб пляцоўцы Мотавела, Прэзідэнт падкрэсліў: «Тое, што я хацеў атрымаць ад гэтай пляцоўкі, у 2025 годзе, адчуваю, мы атрымаем. І адсюль будзем развіваць свае вытворчасці. А вам вялікі дзякуй, вы малайцы». Аляксандр Лукашэнка расказаў аб планах у найбліжэйшую пяцігодку пабудаваць у Мінску яшчэ пяць такіх тэхнапаркаў. Адной з пляцовак стане завод «Гарызонт», дзе будуць ствараць высокатэхналагічныя вытворчасці. Як заўважыў Прэзідэнт, «менш жалеза — больш мазгоў».

«Па жыллі я сказаў, як будзем развівацца. Па зарплаце — што заробіце, тое ваша. Вытворчасць як будзем развіваць, я сказаў. Што датычыцца гандлю, шмат чулі: формула справядлівасці. Ніхто людзей не павінен абдзіраць, набіваць кішэні і вывозіць за межы краіны», — дадаў беларускі лідар.

## «Мы ўсё можам зрабіць, галоўнае — прадаць»

Для развіцця Мотавелазавода дзяржавай у апошнія гады зроблена вельмі шмат. Гэта прадпрыемства пастаянна знаходзіцца пад увагай Прэзідэнта. Ён неаднаразова адзначаў, што гэта брэнд краіны, які неабходна захаваць. Сёлета знакамітыя маркі «МІНСК» і «АИСТ», вядомыя далёка за межамі нашай краіны, адзначаюць сваё 80-годдзе. У 2024 годзе ўведзены ў эксплуатацыю цэх металаканструкцый, зборачны цэх, складскі комплекс. З ліпеня пачаў працаваць новы цэх афарбоўкі. Па выніках 11 месяцаў 2024 года прадпрыемства спрацавала з чыстым прыбыткам, забяспечваючы прырост заработнай платы. Доля экспарту ў агульным аб'ёме рэалізацыі перасягнула 35 працэнтаў. Праведзена работа па павышэнні ўзроўню лакалізацыі вытворчасці. У мінулым годзе на магутнасцях прадпрыемства зманціраваны і запушчаны ўчастак па тэсціраванню і зборцы літыевых акумулятарных батарэй — ёсць планы па распрацоўцы і выпуску электратранспарту. Адзін з супрацоўнікаў прадпрыемства спытаў у Прэзідэнта, ці магчыма атрымаць дзяржзаказ на такую прадукцыю для забеспячэння электравеласіпедамі і матацыкламі медыкаў, міліцыі, ваенных і іншых службаў, асабліва ў сельскай мясцовасці. «Усё, што трэба, я вам зраблю. Далей — вырабляйце і прадавайце», — адказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што беларусы могуць вырабіць усё, нават касмічную ракету. Але галоўнае пытанне — час і грошы. А лішніх грошай няма. Таму, заўважыў